*Тв.*: Podróz po Azji Środkowej. Warszawa, 1958.

*Літ.*: Акрамов Н.М. Вопросы истории, археологии и этнографии народов Памира и Припамирья в трудах Б.Л.Громбчевского. Душанбе, 1974; Ярмоленко В.А. Горные инженеры Беларуси — питомцы Санкт-Петербургского горного института. Мн., 1998.

*В.А.Ярмоленка.*

**ГРА́НСФЕЛД** (Gransfeld) Джон Мэйс (н. 10.10.1958, г. Чыкага, ЗША), касманаўт ЗША. Д-р філасофіі ў галіне фізікі (1988). Скончыў Масачусецкі тэхнал. ін-т (1980), Чыкагскі ун-т (1984). З 1992 у атрадзе касманаўтаў НАСА, з 2003 кіраўнік навук. праграм НАСА. Здзейсніў 4 палёты ў складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 2—18.3.1995 на КК «Індэвар», 12—22.1.1997 на КК «Атлантыс» і арбітальнай станцыі «*Мір*», 20—28.12.1999 на КК «Дыскаверы» (як спецыяліст), 1—12.3.2003 на КК «Калумбія» (як камандзір па карыснай нагрузцы). У космасе правёў 45,7 сут, у т.л. ў адкрытым космасе 37,5 гадз (5 выхадаў). Залатыя медалі НАСА «За выдатныя заслугі», «За выключныя заслугі» (3), «За касмічны палёт» (4).

*М.М.Касцюковіч.*

**ГРО́МАЎ** Ігар Мікалаевіч (н. 29.3.1937, Масква), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі буд. вытв-сці і педагог. Канд. тэхн. н. (1974), дац. (1977). Засл. работнік нар. адукацыі Беларусі (1991). Скончыў БПІ (1966). З 1967 у Бел. нац. тэхн. ун-це (у 1981—97 дэкан). Навук. працы па тэхналогіі вытв-сці бетонных работ. Распрацаваў тэхнал. правілы аўтамаб. транспартавання бетонных сумесей. Аўтар падручнікаў для ВНУ.

*Тв.*: Технология строительного производства. Мн., 1985 (у сааўт.); Технология, механизация и автоматизация строительства. М., 1990 (у сааўт.).

**ГРЫГАРО́ВІЧ** Ядвіга Дамінікаўна (н. 24.8.1946, в. Даманова Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педагогікі, дзярж. дзеяч. Д-р пед. н. (2003), праф. (1995). Засл. работнік адукацыі Беларусі (1999). Чл.-кар. Бел. акадэміі адукацыі (1995). Ганаровы праф. Шлёнскага ун-та (Польшча, 1994). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1969) і Мінскі лінгвістычны ун-т (1994). З 1969 у НДІ педагогікі (у 1977—82 заг. лабараторыі, заг. аддзела). З 1982 у Бел. ун-це культуры (у 1988—92 заг. кафедры педагогікі сац.-культ. дзейнасці, прарэктар, з 1992 рэктар). Нам. старшыні Камісіі па сац. пытаннях Савета Рэспублікі Нац. сходу Рэспублікі Беларусь (з 2000). Чл. Каардынацыйнага к-та жанчын-парламентарыяў Міжнар. парламенцкага саюза (з 2001). Навук. працы па тэорыі і методыцы эстэт. выхавання моладзі, сац. педагогіцы, культуралогіі, псіхолага-пед. асновах прафес. падрыхтоўкі студэнтаў да сацыякульт. дзейнасці, праблемах культуралагічнай універсітэцкай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

*Тв.*: Падрыхтоўка кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы. Мн., 2001 (разам з А.І.Смолікам, Л.М.Рагачовай); Сацыякультурная дзейнасць: сутнасць, прынцыпы, функцыі // Сац.-пед. работа. 2001. № 6; Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект. Мн., 2002; Псіхолага-педагагічная сутнасць сацыякультурнай дзейнасці // Весн. БДУ культуры. 2003. № 2.

**ГРЫГО́Р'ЕЎ** Аляксандр Дзмітрыевіч (н. 4.1.1949, г. Крычаў Магілёўскай вобл.), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (2000), праф. (2002). Скончыў БДУ (1972), Ваенна-паліт. акадэмію ў Маскве (1986). З 1972 сакратар Крычаўскага райкома ЛКСМБ. З 1974 у Сав. Арміі, у 1991—94 ва Узбр. Сілах Расіі. З 1995 выкладчык кафедры сац. педагогікі і прафес. майстэрства Бел. пед. ун-та. Даследуе гісторыю сац. работы на Беларусі ад старажытнасці да нашага часу. Адзін з аўтараў навуч. дапаможнікаў «Сацыяльная работа на Беларусі з непаўналетнімі злачынцамі: гісторыя, праблемы, тэндэнцыі» (2000, з М.А.Кожуравай), «Сацыяльна-педагагічная карэкцыя дэвіянтных паводзін падлетка» (2001, з Г.Ф.Бядулінай, І.І.Прачаковай).

*Тв.*: Очерки истории социальной работы на Беларуси. Мн., 1998; Становление и развитие социальной работы на Беларуси (X—XX вв.). Мн., 2000; Социальная работа на Беларуси: история, опыт, проблемы. Мн., 2000.

**ГРЫГО́Р'ЕЎ** Аляксей Сафронавіч (н. 12.6.1929, в. Кашуціна Духаўшчынскага р-на Смаленскай вобл., Расія), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1983), праф. (1984). Скончыў Гродзенскі с.-г. ін-т (1963). З 1944 на гасп. рабоце у Смаленскай, Мінскай, Гродзенскай абл. (у 1960—62 нам. дырэктара Гродзенскага абл. трэста саўгасаў, з 1962 нач. Воранаўскага вытв. ўпраўлення сельскай гаспадаркі). З 1968 у Гродзенскім агр. ун-це (у 1968—82 прарэктар, у 1982—93 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі на аснове паскарэння навук.-тэхн. прагрэсу.

*Тв.*: Экономические условия индустриализации животноводства. Мн., 1975; Научно-технический прогресс и эффективность животноводства. Мн., 1985; Основы внешнеэкономических связей: Курс лекций. Гродно, 1995; Экономика сельского хозяйства. Гродно, 1997.

**ГРЫГО́Р'ЕЎ** Юрый Панцеляймонавіч (н. 29.5.1932, г.п. Кулоціна Наўгародскай вобл., Расія), бел. і рас. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1976). Засл. архітэктар Расіі (1993). Чл.-кар. Рас. АМ (2001). Ганаровы акад. Рас. акадэміі архітэктуры і буд. навук (2001). Скончыў Маскоўскі арх. ін-т (1956). Працаваў у ін-тах «Белпрампраект», «Мінскпраект» (у 1965—74 кіраўнік комплекснай арх. майстэрні). У 1974—86 нам. старшыні Дзяржбуда Беларусі, гал. архітэктар Мінска. З 1986 1-ы нам. старшыні К-та па архітэктуры і горадабудаўніцтве, 1-ы нам. гал. архітэктара Масквы. З 1994 адначасова дырэктар Маскоўскага н.-д. і праектнага ін-та тыпалогіі, эксперым. праектавання. Асн. работы: генпланы многіх буйных прамысл. аб'ектаў у гарадах Беларусі (1957—61), у Мінску — шэраг будынкаў н.-д. ін-таў АН Беларусі (1964—75), студэнцкія гарадкі БДУ, БПІ і радыётэхн. ін-та (1964—75), жылы дом па вул. Сурганава, комплексы ін-таў культуры і павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў нар. гаспадаркі Беларусі (1975), *Дом літаратара*, крыты каток (абодва 1976), аэравакзальны комплекс аэрапорта «Мінск-2» (1980), будынак упраўлення Мінскага метрапалітэна і станцыя метро «Кастрычніцкая» (1984), забудова і рэканструкцыя вул. Багдановіча і Я.Коласа, забудова мікраbriefраёнаў Зялёны Луг-6 і Сурганава (1980-я г.; усе у сааўт.), помнікі М.Калініну (1978) і А.Пушкіну (2002). У 1973—75 старшыня праўлення Саюза архітэктараў Беларусі. Сярод работ у Маскве: забудова жылых раёнаў Паўночнае, Паўднёвае Бутава, Жулебіна, Мар'інскі парк (1989—2002, у сааўт.), будынкі Акад. школы акварэлі, ашчаднага банка на Нікіцкім бульвары, «Новы манеж», Берлінскі дом на Пятроўцы, шматфункцыян. цэнтры на Цвярской вул. і Садовым кальцы, ансамблі жылых комплексаў «Залатыя Ключы», «Рубцоўская набярэжная» і інш. (усіх кіраўнік аўтарскіх калектываў), помнікі Кірылу і Мяфодзію на Славянскай пл., Г.К.Жукаву на Манежнай пл., Абаронцам зямлі Расійскай на Кутузаўскім праспекце, С.Рахманінаву на Страсным бульвары.

Іл. гл. да арт. *Аэравакзал, Масква, Мінск.*

*Тв.*: Город-герой Минск. М., 1976 (разам з В.І.Анікіным).

*Т.Р.Мартыненка.*

**ГРЫ́НГАРД** (Greengard) Пол (н. 11.12.1925, Нью-Йорк), амерыканскі вучоны ў галіне біяхіміі. Д-р філасофіі (1953). Скончыў Гамільтонскі каледж (1948). З 1953 працаваў у біяхім. лабараторыях Лондана і г. Бетэсда (ЗША), з 1959 у фармацэўтычнай кампаніі Гейгі. З 1968 праф. Іельскага, з 1983 (праф. і заг. лабараторыі) Ракфелераўскага ун-таў. Навук. працы па вывучэнні сінаптычных сувязей у нерв. сістэме. Выявіў, што, акрамя класічных эфектаў на мембранныя патэнцыялы, многія нейрамедыятары і некат. нейрапептыды ўздзейнічаюць на біяхім. працэсы ў цытаплазме нейронаў і ўплываюць на ўтварэнне складаных станаў нерв. сістэмы — эмоцый, настрояў, матывацый. Нобелеўская прэмія 2000 (з А.*Карлсанам* і Э.*Кэндэлам*; гл. Дадатак).

*В.Ф.Ермакоў.*

**ГРЫНЯВЕ́ЦКІ** Васіль Ігнацьевіч (1871—27.3.1919), расійскі цеплатэхнік, стваральнік першых цеплавозаў. З бел. шляхты. Скончыў Маскоўскае тэхн. вучылішча (1896), з 1900 яго прафесар, з 1914 — дырэктар. Даследаваў рабочыя працэсы, якія адбываюцца ў паравых машынах, кацельных агрэгатах і рухавіках унутр. згарання. У 1905 распрацаваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ